# СЕКЦЫЯ 7. ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА.
# ПАДСЕКЦЫЯ 1. ГІСТОРЫЯ СЛАВЯНСКІХ ЛІТАРАТУР

## АЎТАР І ГЕРОЙ У АПОВЕСЦІ В. Ф. КАРАМАЗАВА «ЗЯМЛЯ ФЕРДЫНАНДА»

**Т. А. Аляшкевіч**

*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы,*
*вул. Ажэшкі, 22, 2300230, г. Гродна, Беларусь, tania2001@tut.by*

Аналізуецца спецыфіка суадносін і ўзаемаадносін аўтара і героя ў структуры мастацка-біяграфічнай аповесці «Зямля Фердынанда» з мэтай выяўлення аўтарскай канцэпцыі асобы мастака і творчасці. У названую канцэпцыю ўваходзяць сцвярджэнне духоўнасці і ўспрыняцце рэальнасці праз прызму духоўнай прыгажосці. Выяўлена, што вобразы аўтара і героя часта становяцца ўзаемапранікальнымі і ўзаемапераходнымі.

***Ключавыя словы:*** аўтар; герой; аповесць; Віктар Карамазаў; беларуская літаратура.

## АВТОР И ГЕРОЙ В ПОВЕСТИ В. Ф. КАРАМАЗОВА «ЗЕМЛЯ ФЕРДИНАНДА»

**Т. А. Олешкевич**

*Гродненский государственный университет имени Янки Купалы,*
*ул. Ожешко, 22, 2300230, г. Гродно, Беларусь, tania2001@tut.by*

Анализируется специфика взаимоотношений автора и героя в структуре художественно-биографической повести «Земля Фердинанда» с целью раскрытия авторской концепции личности художника и творчества. В названную концепцию входят утверждение духовности, восприятие действительности сквозь призму духовной красоты. Выявлено, что образы автора и героя часто становится взаимопроникающими и взаимопереходными.

***Ключевые слова:*** автор; герой; повесть; Виктор Карамазов; белорусская литература.

У літаратуразнаўчай навуцы ёсць шэраг даследаванняў, у якіх прадметам навуковай рэфлексіі выступае праблема аўтара і героя. Найбольш каштоўныя назіранні ў гэтым рэчышчы зроблены М. Бахціным у рабоце «Аўтар і герой у эстэтычнай дзейнасці». Даследчык прапануе сваю метадалогію пры вывучэнні вобраза аўтара і вобраза героя. Н. Тамарчанка, абапіраючыся на ідэі М. Бахціна, робіць выснову, што герой – гэта «такая дзеючая асоба літаратурнага твора, якая ўяўляе сабой

“каштоўны цэнтр” і “канкрэтны прадмет” аўтарскага эстэтычнага бачання, будучы носьбітам асноўнай падзеі (Бахцін) у выяўленым свеце, а таксама – істотнага для аўтара-творцы пункту погляду на рэчаіснасць, на самога сябе і іншых персанажаў» [1, с. 43]. Праблема ўзаемаадносінаў аўтара і героя даследуецца ў працах Р. Барта, У. Вінаградава, Н. Тамарчанкі і інш.; суб’ектная арганізацыя твора стала ў цэнтры ўвагі Б. Кормана, а суб’ектнай арганізацыі літаратурнага героя прысвечана, напрыклад, кніга Л. Гінзбург «Аб літаратурным героі».

Што тычыцца назіранняў над праблемай аўтара і героя ў творчасці В. Карамазава, то, безумоўна, у цэлым на такую праблему звярталася ўвага з боку беларускіх даследчыкаў (напрыклад, артыкулы А. Бельскага, Л. Галубовіча, Д. Дудзінскай, Н. Налётавай). Аднак спецыяльнага разгляду пытання не праводзілася. У гэтым мы бачым апраўданасць звароту да абранай тэматыкі.

З’яўленне на пэўным творчым этапе пісьменніка аповесці пра геніяльнага жывапісца Фердынанда Рушчыца было абсалютна прадказальным: В. Карамазаў стварыў шэраг кніг пра мастакоў: Вітольда Бялыніцкага-Бірулю («Крыж на зямлі і поўня ў небе: Эскізы, эцюды і споведзь Духу, альбо Аповесць-эсэ жыцця жывапісца і паляўнічага Бялыніцкага-Бірулі», 1991), Гаўрылу Вашчанку («Брама: аповесць», 2006), Антона Бархаткова («Антон: аповесць-эсэ ў стылі рэтра», 2006), Станіслава Жукоўскага («Краса і воля: аповесць, эсэ, альбом», 2008), Мікалая Неўрава («Мастак і парабкі: апошняя вясна Мікалая Неўрава», 2011). І вось у 2017 г. у часопісе «Дзеяслоў» была надрукавана аповесць В. Карамазава «Зямля Фердынанда», прысвечаная знакамітаму беларускаму пейзажысту Фердынанду Рушчыцу.

Аўтарская пазіцыя ў творы, якая ўключае ў сябе этычную і эстэтычную ацэнку розных бакоў рэчаіснасці, раскрываецца перш за ўсё ў вобразе галоўнага героя Фердынанда Рушчыцаю. Аўтар выказвае свае адносіны да яго светаадчування, яго каштоўнасных арыенціраў, таму засваенне персанажнай сферы твора дазваляе спасцігнуць і духоўны свет аўтара.

Так, аўтарская пазіцыя В. Карамаза выяўляецца найперш у самім выбары героя. У прозе пісьменніка можна вылучыць некалькі асноўных тыпаў герояў. Аднак у апошні перыяд сваёй творчасці В. Карамазаў звяртаецца да аповеду аб жыцці, творчым лёсе беларускіх мастакоў, у чым таксама бачыцца і новы вектар у тэматычнай скіраванасці нацыянальнай эпічнай формы – мастацка-біяграфічнай аповесці.

Такое шчырае імкненне распавесці пра айчыннае мастацтва і яго дзеячаў сталася вынікам самога жыццёвага зацікаўлення пісьменніка, яго прафесійнага ладу жыцця. Жывапіс – яшчэ адно сур’ёзнае захапленне

В. Карамазава. Такі факт нельга пакінуць па-за ўвагай, таму што ў гэтым (але не толькі) крыецца спецыфіка рэалізацыі аўтарскай канцэпцыі ў творы, стаўленне творцы да свайго героя. «Гэтакая праца [праца над аповесцю – *Т. А.*] патрабуе ад мяне майго ўласнага жыццёвага вопыту не менш, як жыццёвага вопыту літаратурнага героя» [2].

Своеасаблівасць жанру твора (хоць аўтарам ён вызначаны проста – аповесць) – «мастацка-біяграфічная» аповесць – патрабуе стварэння цэласнага вобраза героя і цэльнай мастацкай карціны свету. Менавіта занятак жывапісам, лічым, дае магчымасць аўтару і герою знаходзіцца ў цеснай мастацка-эстэтычнай узаемасувязі. Акрамя таго, перад аўтарам мастацка-біяграфічнай аповесці стаіць задача стварыць мастацкі свет іншага творцы, непаўторнае аблічча іншага мастака. В. Карамазаў выступае ў ролі таго, хто ў пэўнай ступені ацэньвае «чужое» мастацтва. Таму паміж аўтарам і героем ўзнікаюць адносіны паразумення ці непаразумення, згоды ці нязгоды. Больш за тое, эстэтычнае крэда Рушчыца – «Маўчы і назірай!» – аргументуецца пунктам гледжання самога В. Карамазава, асоба якога, у сваю чаргу, сфарміравана ў іншай культурна-гістарычнай прасторы і ў іншым часе.

Для В. Карамазава самай асноўнай задачай у дадзеным творы з'яўляецца ўвасабленне ўласнай канцэпцыі асобы і творчасці геніяльнага жывапісца. Галоўны герой аповесці – Фердынанд Рушчыц – мастак, пейзажыст, жыццё якога падпарадкавана найвышэйшым законам гармоніі. Ён вельмі тонка, можна сказаць, надрыўна адчувае рэчаіснаць, імкнецца выявіць яе ў такой ступені натуральна, што часам, «калі глядзеў на зробленае … адчуваў сябе шчаслівым» [3, с. 5].

Менавіта вакол галоўнага героя твора выбудоўваюцца ўсе астатнія вобразы аповесці. Аўтар мастацкага твора, у тым ліку мастацка-біяграфічнага, як «носьбіт напружана-актыўнага адзінства завершанага цэлага, цэлага героя і цэлага твора, трансгрэдыентнага кожнаму асобнаму моманту яго» [4, с. 47], імкнецца дапамагчы чытачу зразумець светабачанне героя праз прызму ўласнай свядомасці і свядомасці персанажаў. Усе дзеючыя асобы, якія выступаюць ў творы, адносяцца да рэальнага свету. Аднак гэты свет часова аддалены ад аўтарскага. В. Карамазаў пераносіць чытача на стагоддзе назад, і гэты факт дае магчымасць аўтару своеасабліва рэпрэзентаваць дакументальны і мастацкі свет, рэальнае жыццё і жыццё мастацкае, перастворанае. Аўтару не даводзіцца пераконваць у патэнцыяльнай рэалістычнасці апісваемых падзей. Усё, пачынаючы ад назвы аповесці (якая з'яўляецца сімвалічнай: «зямля» – роднае гняздо Фердынанда Рушчыца, «Зямля» – назва адной з карцін мастака, якая зрабіла моцнае ўражанне на тагачаснае мастакоўскае

асяроддзе), месца дзеяння (вельмі часта гэта родны Рушчыцу Багданаў), дзённікавых запісаў героя, якія маюць датаванне, іншых дзеючых асоб твора (Куінджы, Пурвіт, Урублеўскі, Макоўскі), толькі ўзмацняе эфект праўдападабенства. Сістэмнае ўключэнне «чужога маўлення» (дзённікавыя запісы) у аповед зноў-такі мае рэалістычную матывіроўку.

Фердынанд Рушчыц займае своеасаблівую пазіцыю ў творы. У яго вусны пісьменнік укладае найбольш сур'ёзныя роздумы пра красу, пра мастака, напрыклад: «Краса, я думаю, чужой нікому не бывае. Яна, як ёсць, слугуе не аднаму камусьці, не аднаму нават таму, хто яе стварыў, не аднаму народу, хоць ён і гаспадар яе, як Бог стварыў – не аднаму і Богу, яна слугуе ўсім, каму патрэбная» [3, с. 46]. Альбо: «Мастак, працуючы, не можа ўлічваць чыесьці густы…У мяне свой густ і свае нормы. Я іду ад сваіх каранёў, якіх ніхто ў мастацтве, акрамя мяне, не ведае. Я не для іх пішу, і нават не для выстаў, а для сябе» [3, с. 50]. Такая акалічнасць тлумачыцца намі з пазіцыі аўтапсіхалагічнага плану ў творы. Аўтар і галоўны герой аказваюцца псіхалагічна роднаснымі. Прасочваецца прамая сувязь паміж духоўнай праблематыкай, да якой звяртаўся В. Карамазаў, і праблематыкай, якая займала Фердынанда Рушчыца. Менавіта з гэтай прычны аўтару ўдаецца дасягнуць дакладнасці аповеду. Тым больш, як прызнаваўся сам В. Карамазаў, «цяжка пісаць пра мастакоў, якія жылі і памерлі, таму што ў нас няма архіваў. Але мне не патрэбная ўся біяграфія мастака, мне трэба быць моцна ўражаным яго [мастака – *Т. А.*] творчым, духоўным подзвігам або яго трагедыяй, ёю запаліцца, у яе ўвайсці і яе разгадаць, маючы ўсяго некалькі даставерных фактаў з жыцця, але такіх, якія даюць лагічную і дастатковую прастору для псіхалагічнага мастацкага аналізу» [2]. Пісьменнік малюе героя знутры, звяртаючыся да ўнутранага маналога, разважанняў і дзённіка героя. Часам унутраны маналог героя пераходзіць у аўтарскі роздум. Але вельмі часта аўтарскія разважанні аказваюцца тоеснымі думкам героя. Асабліва гэта становіцца адчувальным у тых фрагментах аповеду, калі маўленне апаведача ўбірае ў сябе голас героя, які, у сваю чаргу, цалкам можа быць суаднесены з аўтарскім голасам. Напрыклад: «Убачыць у карціне, якую пішаш, адразу ўсё, што ў ёй павінна быць, не ўдаецца, увесь час, калі працуеш, узнікае штосьці новае перад вачыма, у думках, адчуваннях, кожны мазочак, настроі і дэталі залежаць ад мазкоў, дэталяў і настрояў іншых, ад таго, як тыя атрымаюцца пад пэндзлем» [3, с. 25]. Вельмі цікавым бачыцца фрагмент, які фармальна належыць апаведачу (ён суб'ект маўлення), але свядомасць выражаецца аўтарская, моцна злітая са свядомасцю мастака Рушчыца: «…у сваіх назіраннях і захапленнях мастак не толькі назіральнік, тым больш не фіксатар, не капііст прыроды, нават і самых дасканалых яе красак і

настрояў, ад яго вока і адчуванняў не хаваецца глыбока ўнутраная энергія прыроды, яе найтанчэйшая музыка і пастаянны, нават уначы, рух» [3, с. 53].

Часам сустракаем няўласна-простую мову, у якой прачытваецца свядомасць не апаведача, а хутчэй героя: «Як далей жыць і працаваць, ад каго, калі не ад Куінджы, чакаць цяпер творчай падтрымкі? Адміністрацыя дасць новага настаўніка? А якога? Не іначай, як такога, што скамандуе: "Рукі па швам"? Як з галавы і сэрца выкінуць маральную атруту апошніх дзён і супакоіцца, каб падысці да мальберта?» [3, с. 11].

Яшчэ адным сродкам раскрыцця вобраза асноўнага героя з'яўляецца ўвядзенне даволі шырока кола другарадных герояў, якія «правакуюць» выяўленне разнастайных сітуацый, у якіх высвечваюцца розныя грані асобы мастака. Так, праз няспраўджанае каханне да Гэлены Макоўскай, паненкі, «надзвычай годнай і блізкай яму па сэрцы і думках» [3, с. 93], аўтар раскрывае такі бок характару героя, як яго бязмежную любоў да сваёй Бацькаўшчыны. У адным са сваіх дзённікавых запісаў Рушчыц прызнаецца: «Дзённік мой! Каб ты ведаў, як найперш за ўсё я прагну быць добрым сынам сваёй Бацькаўшчыны, для яе працаваць, араць і, калі што ўзрасце, прынесці ёй увесь плён, бо люблю яе ўсім сэрцам і толькі ёй належу целам і душою» [3, с. 77].

У канцы аповесці В. Карамазаў імкнецца адказаць на пытанне, чаму Рушчыц назаўсёды пакінуў палітру і пэндзлі і стаў выкладаць. Ён заключае, што гэтым самым Фердынанд пакінуў «загадку лёсу не толькі пазнейшаму часу, але і бліжэйшым сучаснікам» [3, с. 92]. І далей прапануе сваю «гіпотэзу», згадваючы папярэджанні Пурвіта, бліжэйшага сябра Рушчыца, «што на суседнім захадзе іншая жывапісная школа, натурны рэалізм не ў пашане, там лёгка згубіць сябе як мастака-рэаліста» [3, с. 93]. І менавіта такі ўчынак Фердынанда не сімпатызуе аўтару, на гэты раз ён не раздзяляе пазіцыю мастака.

В. Карамазаў у сваёй творчасці адштурхоўваецца ад рэальнага жыцця, ад яго непасрэднага ўспрымання, ад асабістых назіранняў і захапленняў, што самым непасрэдным чынам накладае адбітак на стварэнне вобразаў герояў. Каб наблізіцца да разумення хаця б некаторых бакоў унутранага свету Фердынанда Рушчыца, недастаткова толькі таленту, тут патрэбныя яшчэ час на тое, каб «ужыцца» у свет героя-мастака. Думаецца, што менавіта занятак жывапісам, паездка на радзіму мастака-жывапісца дапамаглі В. Карамазаву і наблізілі аўтара да той структуры аповесці, у якой натуральна злітыя планы гістарычны і псіхалагічны.

Той факт, што В. Карамазаў абірае галоўным героем сваіх кніг, і ў прыватнасці аповесці «Зямля Фердынанда», жывапісца, гаворыць пра

эстэтычнае крэда Карамазава – сцвярджэнне духоўнасці, успрыняцце рэальнасці праз прызму духоўнай прыгажосці.

Вобразы аўтара і героя часта становяцца ўзаемапранікальнымі і ўзаемапераходнымі. В. Карамазаў даволі проста «раствараецца» ў сваім персанажы, часам адчувае з ім «кроўную роднасць». Аповед вядзецца ад трэцяй асобы, аднак за ім дакладна акрэсліваецца пэўная пазіцыя і гуманістычны погляд на свет.

Асаблівасцю героя Карамазава з’яўляецца ярка выражаны духоўны пачатак. Прынцыповае значэнне ў аповесці мае эмацыянальны партрэт героя, уменне таго ўспрымаць прыгожосць і прыроду.

Характэрнымі прыёмамі стварэння вобраза героя з’яўляецца не «знешні» партрэт, а ўнутраныя замалёўкі з яўным элементам аўтарскай ацэнкі характару.

Аповесць пабудавана такім чынам, што ў ёй аповед ад трэцяй асобы пераплятаецца з дзённікавымі запісамі, што дае магчымасць аўтару больш глыбока даследаваць унутраны характар галоўнага героя. Выкарыстанне дзённікавай формы, з аднаго боку, дыстанцыруе аўтара ад героя, з другога – дазваляе герою даволі адкрыта самавыражацца.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Поэтика : слов. актуал. терминов и понятий / Н. Д Тамарченко [и др.] ; под ред. Н. Д. Тамарченко. М. : Издательство Кулагиной; Intrada, 2008.

2. Віктар Карамазаў: «Імкнуся паказаць, як выяўляецца творчая асоба» [Электронны рэсурс]. URL: https://lit-bel.org/news/Vktar-Karamaza-mknusya-pakazatsy-yak-viyal-yaetstsa-tvorchaya-asoba-8128/ (дата звароту: 01.03.2021).

3. Карамазаў В. Ф. Зямля Фердынанда : аповесці, апавяданні, эсэ. Мінск : Беларусь, 2018.

4. Бахтин М. М. Автор и герой в эстетической деятельности // Бахтин М. М. Эстетика словесного творчества. Москва : Искусство, 1979.